Цяпер слова *заўзятар* можна пачуць як з вуснаў саміх *заўзятараў*, так і ад тэле- і радыёкамэнтатараў, а таксама адшукаць у прэсе. Вось толькі ў слоўніках яго ўсё яшчэ няма. Зразумела, што слова *заўзятар* паходзіць ад *заўзяты*, а гэта і той, хто стала і з захапленьнем займаецца чым-небудзь, гэта і ўпарты ды напорысты.

Слова *заўзяты* мае бальшыня славянскіх моваў, а вось *заўзятара* — толькі мы.

# Заходнік

***Уладзімер Арлоў***

У Тлумачальным слоўніку беларускае мовы можна єа зьдзіўленьнем вычытаць, што „*заходнік* — гэта прыхільнік заходніцтва як альтэрнатывы славянафільству". Між тым кожнаму беларусу вядома, што *заходнік* — гэта чалавек, якому пашчасьціла жыць на той частцы Беларусі, куды бальшавіцкія парадкі прыйшлі толькі ў верасьні 1939 году. Доўгі час пасьля гэтак званага вызвольнага паходу Чырвонай арміі слова „*заходнік*" у партыйна-савецкім лексыконе азначала чалавека нядобранадзейнага, гатовага ў любы момант здрадзіць сьветлым ідэалам сацыялізму ды схаўрусавацца з клясавым ворагам. Каб *заходнікі* мацней палюбілі родную савецкую ўладу, іх дзясяткамі тысячаў вывозілі ў сібірскія і казахстанскія лягеры. Адных — за тое, што багацей жылі, другіх, як Натальлю Арсеньневу, — за тое, што пісалі вершы пра Беларусь, а не пра БССР, трэціх — проста за тое, што скоса пазіралі на прысланае Масквой начальства.

Тым часам для паспалітых жыхароў усходняе Беларусі слова „*заходнік*" на колькі дзесяцігодзьдзяў сталася сынонімам чалавека заможнага і грунтоўнага. Калі ўсходнікі аддавалі дачку замуж за *заходніка*, лічылася, што дзеўцы пашанцавала. „У нас хлеб з кавалачкам сала, — з зайздрасьцю казалі на спустошанай калгасамі памежнай Полаччыне, — а ў іх, *заходнікаў* глыбоцкіх, — сала з кавалачкам хлеба".

Напрыканцы XX стагодзьдзя колішняга падзелу грамадства на ўсходнікаў і *заходнікаў* нібыта не адчуваецца. Але на *захадзе* краіны па-ранейшаму жывуць лепей. Там чысьцейшыя ды ўтульнейшыя гарады і мястэчкі, там багацейшыя вёскі, дый самі людзі самавіцейшыя. Як казалі калісьці камуністычныя прапагандысты ды агітатары: „Вот оно, тлетворное влияние *Запада*".

# Заходнік

***Рыгор Барадулін***

Змалку памятаю, як лавілі рыбу прыладай, якая называлася „*заходнік*" — літаратурна прынятая назва „таптуха".

З пасьлявайны памятаю таксама іншае значэньне слова „*заходнік*" — жыхар так званых *заходніх* вобласьцяў Беларусі, якія ў 1921 годзе бальшавікі без удзелу прадстаўнікоў Беларусі ў Рызе аддалі пад Польшчу. І ў верасьні 1939 году на штыхах Чырвонай арміі адбылося ўзьяднаньне Беларусі, нават Беласточчына ўвайшла ў склад БССР.

Тады Янка Купала пісаў: „*Ты з* Заходняй, *я з Усходняй нашай Беларусі,*